УДК 78.071:[378+37.018.4](476)

# БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАМПАЗІТАРСКАЯ ШКОЛА: СПРОБА СТРУКТУРАЛІЗАЦЫІ ПАНЯЦЦЯ

***Н. Я. Бунцэвіч,*** *старшы выкладчык кафедры гісторыі музыкі і музычнай беларусістыкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца паняцце нацыянальнай кампазітарскай школы ў дачыненні да сучасных беларускіх рэалій, закранаюцца пытанні прафесійнай падрыхтоўкі кампазітараў і ўплыў на фарміраванне іх эстэтыкі і стылю такіх фактараў, як сістэма музычнай адукацыі ў краіне, вучоба ў канкрэтнага педагога, уздзеянне творчага і жыццёвага асяроддзя з усімі яго магчымымі зменамі, поствышэйшая адукацыя, самаадукацыя і павышэнне кваліфікацыі цягам усяго жыцця. Выказваецца думка, што менавіта гэтыя складнікі ствараюць структуру самога паняцця нацыянальнай кампазітарскай школы. Акцэнтуецца ўзросшае значэнне самаадукацыі і пастаяннага, найперш самастойнага павышэння кваліфікацыі ва ўмовах імклівых грамадскіх змен, асабліва ў сферы распаўсюджвання інфармацыі, запісу музыкі і анлайн-тэхналогій. Даецца сціслы пералік напрацовак мінулага, прыдатных да ўзнаўлення ў Год гістарычнай памяці.

**Ключавыя словы:** нацыянальная кампазітарская школа, музычная адукацыя, эстэтычна-стылёвыя арыенціры, самаадукацыя, павышэнне кваліфікацыі.

# BELARUSIAN NATIONAL COMPOSER SCHOOL: AN ATTEMPT TO STRUCTURALIZE THE CONCEPT

***N. Buncevich,*** *Senior Lecturer of the Department of History of Music and Musical Belarusian Studies of the Educational Establishment «Belarusian State Academy of Music»*

**Abstract.** The article examines the concept of a national composer school in relation to modern Belarusian realities, touches upon the issues of professional training of composers and the influence on the formation of their aesthetics and style of factors such as the system of musical education in the country, studying with a particular teacher, the influence of creative and life environment with all its possible changes, higher education self-education and and lifelong learning. It is suggested that these components form the structure of the very concept of the national school of composition. Emphasis is placed on the growing importance of self-education and continuous, especially self-improvement in the face of rapid social change, especially in the

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

field of information dissemination, music recording and online technology. A short list of past developments suitable for renewal in the Year of Historical Memory is given.
**Keywords:** national school of composition, music education, aesthetic and stylistic guidelines, self-education, advanced training.

Паняцце «нацыянальная кампазітарская школа» яшчэ з XIX ст. трывала ўвайшло ў музычна-крытычны, а следам і навуковы абіход, але дагэтуль застаецца недастаткова распрацаваным. Пад ім звычайна разумеюць нейкія агульныя эстэтычна-стылёвыя рысы, уласцівыя творцам краіны. Аднак у энцыклапедыях, слоўніках і іншай даведачнай літаратуры такі артыкул адсутнічае. У англамоўнай тэрміналогіі нацыянальны кірунак завецца нацыяналізмам – натуральна, без аніякай адмоўнай канатацыі гэтага слова [3]. Між тым, паняцце «нацыянальная кампазітарская школа» ўтрымлівае, на нашу думку, некалькі вельмі важных складнікаў, якія ўплываюць на яе фарміраванне:

– сістэму музычнай адукацыі ў краіне;

– канкрэтнага педагога, пад кіраўніцтвам якога адбываецца непасрэднае спасціжэнне прафесіі, уздзеянне яго педагагічных, творчых і, шырэй, эстэтычных прынцыпаў;

– творчага і жыццёвага асяродку, у якім адбываецца станаўленне і развіццё кампазітарскіх здольнасцей, іншымі словамі, «школа жыцця», ці «жыццё як школа», што надае розныя стартавыя пазіцыі творцам з розных рэгіёнаў і часцяком змяняе эстэтычна-стылёвыя арыенціры кампазітараў пры пераездзе ў іншую краіну;

– паствышэйшую адукацыю кампазітара як сведчанне непарыўнасці і бясконцасці працэсу набыцця і засваення ведаў: разнастайныя майстар-класы, стажыроўкі, творчыя лабараторыі, самаадукацыя і павышэнне кваліфікацыі цягам усяго жыцця.

Роля і значнасць кожнага з гэтых складнікаў з часам змяняецца: уздзеянне адных кампанентаў нацыянальнай кампазітарскай школы на пэўным этапе ўзрастае, іншых – падае.

Музычная адукацыя ў Беларусі трохприступкавая, з усё больш раннім навучаннем не проста музыцы і валоданню тым ці іншым музычным інструментам, а менавіта кампазіцыі, прычым маладымі прафесійнымі кампазітарамі ў якасці настаўнікаў. Сістэма беларускай адукацыі шмат у чым карэлюецца з цэхавай, што існавала ў еўрапейскім прафесійным асяродку розных галін творчасці і вытворчасці і вядомая музыкантам па оперы Р. Вагнера «Нюрнбергскія мэйстэрзінгеры». Уступленне ў пэўную прафесійную гільдыю прадугледжвала навучанне ў майстра і дасягненне максімальна блізкага да яго ўзроўню. Такая сістэма дазваляе трымаць прафесійную планку на належнай вышыні, але можа замаруджваць працэсы абнаўлення ў галіне, з'яўленне новых тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уздзеянне канкрэтнага педагога відавочна. Так, А. Багатыроў заўжды арыентаваў сваіх студэнтаў на меладычнае, гарманічнае развіццё. Д. Смольскі вучыў найперш структурнаму, драматургічнаму мысленню. З класа Я. Глебава, як жартавалі, выходзілі маленькія «глебавічкі», настолькі моцным аказваўся стылёвы ўплыў майстра. Выхаванцы А. Мдзівані пазнаюцца па разуменні формы менавіта як часавога працэсу з бясконцым разгортваннем і размытасцю граняў. Але ўплыў майстра можа быць не толькі прамым, але і ўскосным. Нарэшце, існуюць выпадкі знарочыстага адмаўлення ад назапашанага ў класе. На адным полюсе беларускай музыкі – творчасць І. Комара, які не пераймае, а творча развівае неаімпрэсіяніcцкія памкненні Г. Гарэлавай, прысвяціў ёй камерна-інструментальную кампазіцыю «Лавандавае поле пасля навальніцы», дзе стварыў выдатны творчы партрэт прафесара. На другім полюсе – творчасць В. Кузняцова, які пасля заканчэння вучобы паставіў на мэту свядомае адмаўленне ад «фірмовых» глебаўскіх прыёмаў. Калі што і звязвае яго сёння з настаўнікам, дык гэта ўвага да тэмбавага вырашэння любой партытуры.

Наконт жыццёвага асяродку тая ж Д. Кірнарская адзначае, што «музычная педагогіка як від дзейнасці адлюстроўвае тое, што мы прызвычаліся называць “менталітэтам”, гэта значыць практычным светаўспрыманнем, якое нясе на сабе пячатку ўсяго таго, што называюць нацыянальнай культурай» [1, с. 35]. Тое ж тычыцца і ўласна творчасці. Даўно заўважана, што беларускія кампазітары родам з Гродзеншчыны, дзе па савецкіх часах захавалася больш старажытных архітэктурных помнікаў, актыўней звярталіся да тэмы нацыянальнай даўніны, чым карэнныя мінчане, якія з дзяцінства бачылі збудаванні пераважна пасляваеннага часу. Працяг навучання ці праца ў іншай краіне вымушае лічыцца з мясцовымі асаблівасцямі, выклікае перагляд некаторых эстэтычных пастулатаў. Так, В. Воранаў пасля навучання ў Д. Смольскага апынуўся ў Германіі і заўважыў, што пры ўсёй сваёй арыентаванасці на структурнае мысленне, цалкам падпарадкаванае логіцы формаўтварэння, нямецкія калегі ўспрымаюць яго музыку напісанай «ад жывата», як там называюць творы, пабудаваныя па законах выключна эмацыйнага, а не канструктывісцкага разгортвання з яго безліччу сучасных тэхнік. Зразумела, кампазітар пачаў з яшчэ большай пільнасцю ставіцца да «канструявання» сваіх кампазіцый. Ствараючы ж музыку для беларускай культурнай прасторы (напрыклад, для прэм’ер Тэатра-студыі кінаакцёра), В. Воранаў піша выкшталцоныя партытуры, адпаведныя не распаўсюджаным на Захадзе атмасферным спектаклям, а куды больш традыцыйным беларускім пастаноўкам. Малады кампазітар А. Якушаў у час навучання ў В. Войціка стварыў надзвычай эмацыйныя меладычныя творы неарамантычнага ўхілу. А працягнуўшы вучобу ў Польшчы, настолькі хутка падхапіў тамтэйшую арыентаванасць на сучасныя здабыткі, што яму была замоўлена камерная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

опера-балет «Tytuł, na który mamy nadzieję» («Назва, на якую мы спадзяёмся») на лібрэта польскага рэжысёра Кшыштафа Ціхэньскага, паспяхова пастаўленая ў верасні 2021 г. у Познані.

З часам менавіта апошні складнік кампазітарскай школы, які ахоплівае паствышэйшую адукацыю і разнастайныя віды самаадукацыі, набывае ўсё большую значнасць і здольны перакрыць іншыя прыступкі навучання. Гэта прадыктавана імклівасцю развіцця сучаснага свету, дзе вельмі хутка змяняюцца тэхналогіі, асабліва ў сферы перадачы інфармацыі, запісу і распаўсюджвання музыкі, рэзка павышаецца ці, наадварот, зніжаецца запатрабаванасць пэўных прафесій, з'яўляюцца новыя сферы дзейнасці, у т. л. у галіне культуры і мастацтва. Тая ж Д. Кірнарская гаворыць аб тым, што «мы вучым, магчыма, "не таму", што дазволіць студэнту атрымаць поспех у кар'еры» [2, с. 19].

Як прыклад, у вельмі распаўсюджаных, прывабных для публікі жанрах мюзікла і рок-оперы сёння вельмі паспяхова працуюць музыканты без дыпломаў кампазітара. Бліскучы піяніст, лаўрэат міжнародных фартэпіянных конкурсаў Ілья Палякоў стварыў мюзікл «Пра Фядота-стральца», пастаўлены ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры, крыху раней – дзіцячы мюзікл «Воўк і сямёра казлянят» у ТЮГу. У Маладзёжным тэатры эстрады ў гэтым жанры паспяхова працуе артыст тэатра Аляксандр Сухараў, на рахунку якога ўжо з дзясятак выдатных твораў. У НАДТ імя М. Горкага – загадчык музычнай часткай Аляксей Еранькоў, які з'яўляецца колішнім выпускніком Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. У тым жа тэатры пастаўлена рок-опера «Граф Монтэ-Крыста» Цімура Каліноўскага. У ТЮГу цудоўную музыку пачаў пісаць адзін з вядучых артыстаў Генадзь Гаранскі. Веды, неабходныя для стварэння музыкі і давядзення свайго праекта да прыдатнага для выкарыстання прадукта (напрыклад, у выглядзе гатовых трэкаў інструментальнай фанаграмы), у большасці набываліся імі самастойна.

Як паказала эвалюцыя прыроды і чалавецтва, найбольш жыццястойкімі аказваюцца не самыя дужыя ці адораныя большымі разумовымі здольнасцямі, а тыя, хто ўмеюць хутчэй выпрацоўваць якасці, патрэбныя ў новых умовах. Разуменне гэтага вымушае перагледзець некаторыя прынцыпы выхавання кампазітараў. Сярод асноўных задач сучаснай кампазітарскай адукацыі на першы план выходзіць не толькі традыцыйная перадача ведаў, навыкаў, уменняў, але і навучанне як мага большай самастойнасці ў іх далейшым набыцці і практычным выкарыстанні. Больш мабільным у гэтым плане аказаўся БДУКМ, дзе адкрыта аддзяленне камп'ютарнай музыкі, ёсць спецыяльнасць аранжыроўшчыка і выкладаецца кампазіцыя – найперш як прыкладная дысцыпліна: А. Цапко, нядаўні выпускнік БДАМ па класе кампазіцыі Г. Гарэлавай, вучыць студэнтаў логіцы музычнага пісьма, асновам музычнай формы і г. д. і свядома дае сваім выхаванцам уяўленне пра магчымасці далейшага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заробку з дапамогай атрыманых прафесійных ведаў. У БДАМ навучанне кампазіцыі скіравана на акадэмічную музыку, што цалкам справядліва і неабходна. Але ўлічваючы сучасную запатрабаванасць прафесіяналаў у эстрадных кірунках, шоу-бізнесе, сумежных сферах у галіне сінтэзу мастацтваў, было б слушна ўвесці дадатковыя спецыялізацыі ў прыкладных жанрах.

У Год гістарычнай памяці мэтазгодна згадаць правобраз ланкастэрнай сістэмы музычнай і харэаграфічнай адукацыі, які склаўся ў другой палове XVIII ст. на сучасных беларускіх землях у школах пры магнацкіх капэлах і оперных тэатрах: запрошаны замежны майстар займаўся з самымі адоранымі з ліку сялянскай моладзі, а тыя, у сваю чаргу, з усімі астатнімі. Не менш цікавым можа аказацца вопыт аматарскага музыцыравання беларускай шляхты таго ж часу, музычнай адукацыі ў асяродку расійскай Магутнай кучкі ў сярэдзіне XIX ст., правядзення «музычных серад» у Беларускім саюзе кампазітараў і спробы аднавіць у новым фармаце такую форму паказу і абмеркавання твораў маладых кампазітараў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў пачатку XXI ст.

1. *Кирнарская, Д. К.* Национальный менталитет в музыкальной педагогике: Россия VS Запад / Д. К. Кирнарская // Музыка как национальный мир искусства : материалы Междунар. науч. конф., Казань, 23–25 апр. 2015 г. / Казан. гос. консерватория им. Н. Г. Жиганова. – Казань, 2015. – С. 34–45.

2. *Кирнарская, Д. К.* Реформа музыкального образования в XXI в.: как, зачем и почему / Д. К. Кирнарская // Науч. тр. Белорус. гос. акад. музыки. – Минск, 2018. – Вып. 44 : Профессиональное музыкальное образование на современном этапе: традиции и новации. – С. 13–28.

3. Национальное направление // Музыкальный словарь Гроува. – М. : Практика, 2001. – С. 597–598.

УДК 801.81:392.51(=081)(476.5)

# ОСОБЕННОСТИ СВАДЕБНОГО ОБРЯДА СЕВЕРО-ВОСТОКА БЕЛАРУСИ (ПООЗЕРЬЯ)

**С. Ф. Войтик,** *доцент кафедры народно-песенного творчества и фольклора учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** В статье дано общее представление об уникальном свадебном обряде дохристианской эпохи, который существовал на территории, заселенной славянскими племенами кривичей. Фрагментарно он со-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ